

Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва

*Віртуальная выстава да тыдня бацькоўскай любові з фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва*

# «Сямейны фотаальбом»

*У Беларусі штогод адзначаюць дзве важныя даты – Дзень маці і Дзень бацькі. Першую з іх – Дзень маці – святкуюць 14 кастрычніка. Другую – Дзень бацькі – беларусы адзначаюць 21 кастрычніка. Прамежак часу паміж гэтымі датамі назвалі Тыднем бацькоўскай любові. Кастрычніцкія дні поўныя асаблівай увагі да бацькоў, падзякі за любоў, якую яны ўкладаюць у выхаванне сваіх дзяцей.*

*У архіве-музеі захоўваецца нямала сямейных фондаў дзеячаў культуры нашай краіны. Віртуальная выстава «Сямейны фотаальбом» – гэта запрашэнне паглядзець на знакамітых дзеячаў беларускай літаратуры і мастацтва вачыма іх родных, убачыць іх у штодзённых імгненнях, якія стануць для творцаў крыніцай натхнення і сілы.*

*Асобы вядомых дзеячаў літаратуры і мастацтва раскрываюцца не толькі праз творчыя біяграфія, але і праз фотаздымкі і сямейныя гісторыі, поўныя момантаў любові, бацькоўскага клопату і звычайных чалавечых радасцяў.*

*Запрашаем пагартаць старонкі віртуальнага сямейнага фотальбома, убачыць людзей, якія ўнеслі неацэнны ўклад у развіццё нацыянальнай культуры, ў якасці бацькоў, сыноў і дачок.*

*У экспазіцыі прадстаўлены сямейныя дакументы з фондаў*

- *Андрэя Аляксандровіча – паэта, перакладчыка, публіцыста, літаратурнага крытыка;*
- *Адама Бабарэкі – літаратуразнаўцы, крытыка, празаіка, паэта;*
- *Цішкі Гартнага – пісьменніка, паэта, драматурга, журналіста, рэдактара;*
- *Максіма Гарэцкага – пісьменніка, літаратуразнаўцы, фалькларыста, публіцыста, грамадскага дзеяча;*
- *Уладзіміра Дубоўкі – паэта, празаіка, перакладчыка, крытыка;*
- *Кандрата Крапівы – пісьменніка, сатырыка, драматурга, перакладчыка, грамадскага дзеяча;*
- *Рыгора Мурашкі – пісьменніка;*
- *Язэпа Пушчы – паэта, крытыка, перакладчыка;*
- *Браніслава Тарашкевіча – грамадска-палітычнага дзеяча, мовазнаўцы, перакладчыка;*
- *Юльяна Дрэйзіна – музыказнаўцы, публіцыста, перакладчыка, педагога;*
- *Міхаіла Забэйды-Суміцкага – опернага спевака, педагога;*
- *Аркадзя Астаповіча – мастака-графіка;*
- *Зінаіды Астаповіч-Бачаровай — мастачкі;*
- *Сендэра (Аляксандра) Палееса – мастацтвазнаўцы, гісторыка, публіцыста;*
- *Міхаіла Сеўрука – мастака-жывапісца і графіка.*



*Родныя паэта Андрэя Александровіча:*
*Маці Соф’я Іванаўна Александровіч*
*Цётка Александра Іванаўна Казляліна (?)*
*Муж цёткі Альбін Нікадзімавіч Казлялін (?)*
*Сястра паэта Алеся Іванаўна Александровіч*
*Будучы паэт Андрэй Александровіч*
*[1920-я гг.]*

Ф. 97. Воп. 1. Спр. 120. Арк. 2.



*Адам Бабарэка з жонкай Ганнай і дочкамі Элеанорай і Алесяй. 1929*

Ф. 407. Воп. 1. Спр. 217. Арк. 1.



*Цішка Гартны з жонкай Надзеяй Жылуновіч [1915]*

Ф. 15. Воп.1. Спр.123. Арк.3.



*Цішка Гартны з сынам Алегам [1920-я гг.]*

Ф. 15. Воп. 1. Спр.123. Арк.6.



*Максім Гарэцкі з жонкай Леанілай і дзецьмі Галінай і Леанідам. 1920-я гг.*

Ф. 426. Воп. 1. Спр. 7. Арк. 5.



*Леаніла Чарняўская (жонка Гарэцкага) з дзецьмі. 1925*

Ф. 426. Воп.1. Спр. 209. Арк. 3.



*Уладзімір Дубоўка з жонкай Марыяй і сынам Альгердам. 1926*

Ф. 407. Воп. 1. Спр. 229. Арк. 4.



*Кандрат Крапіва з жонкай Аленай і сынам Барысам. 1928*

Ф. 407. Воп. 1. Спр.230. Арк.1.



*Рыгор Мурашка з жонкай Соф'яй і дзецьмі Анцінеяй і Генадзем. [1930-я гг.]*

Ф. 441. Воп. 1. Спр.41. Арк. 4.



*Язэп Пушча з жонкай Станіславай і дзецьмі. 1957*

Ф. 26. Воп. 1. Спр. 106. Арк. 2.



*Браніслаў Тарашкевіч з жонкай Верай і сынам Радаславам. Радашковічы. [1925-1926]*
Ф. 443. Воп. 1. Спр. 42. Арк. 1.



*Браніслаў Тарашкевіч з сынам Радаславам. 1930*

Ф. 443. Воп. 1. Спр. 42. Арк. 3.



*У доме Юльяна Дрэйзіна. Злева направа:Іван Краскоўскі, Вера Дрэйзіна, Юльян Дрэйзін, Уладзімір Жылка, Валянціна Краскоўская, Сяргей Дрэйзін, Аляксандра Дрэйзіна. 1927*

Ф. 401. Воп. 1. Спр. 61. Л. 16.



*Міхаіл Забэйда-Суміцкі з маці Александрай Суміцкай. Ружаны. 1912*

Ф. 293. В. 1. Спр. 386.



*Міхаіл Забэйда-Суміцкі з маці Александрай Суміцкай. 1939*

Ф. 293. В. 1. Спр. 387. Арк. 2.



*Аркадзь Астаповіч з жонкай Нінай Рыгораўнай. 1920-я*

Ф. 395. Воп. 1. Спр. 140. Арк. 1.



*Аркадзь Астаповіч з жонкай Нінай Рыгораўнай. 1920-я*

Ф. 395. Воп. 1. Спр. 140. Арк. 1.



*Зінаіда Бачарова (сястра Аркадзя Астаповіча) з мужам Іванам Бачаровым і дачкой Нінай. 1932*

Ф. 395. Воп. 1. Спр. 144. Арк. 15.



*Сендэр Палеес з жонкай Песяй.*
*1924*

Ф. 382. Воп. 1. Спр. 38. Арк. 1.



*Міхась Сеўрук разам з бацькам Канстанцінам Іосіфавічам, маці Аляксандрай Стэфанаўнай і старэйшай сястрой Ксеняй каля дома ў м. Сноў (Нясвіжскі р-н). [1920-я]*

Ф. 518. Воп. 1. Спр. 441. Арк. 3.